Капцюг М.А., студ. гр. 215 ФТБКіСМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Сашчэка В.У.,
канд. культуралогіі, дацэнт

# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ВОБРАЗА СЫМОНА-МУЗЫКІ Ў СПЕКТАКЛІ МІКАЛАЯ ПІНІГІНА

"Сымон-музыка" – другі па велічыні і значнасці пасля "Новай зямлі" паэтычны твор Якуба Коласа. Паэма перанесла тры рэдакцыі, і толькі з трэцяй з іх знаёма большасць з нас. Першая рэдакцыя твора давала першы ключ да разумення паэмы: мела аўтарскі паясняльны падзагаловак "казка жыцця" – як ссылку на адін з улюбёных жанраў мастацкай прозы Коласа, твораў найперш за ўсё алегарычных і іншасказальных.

У аснове сюжэта паэмы – жыццё хлопчыка Сымона. Але Сымон-музыка не просты хлопчык, якога называюць дзіваком, ён – мастак, які адмыкае свет ідэальнага і пускае яго ў свет рэальны. Аўтар паказвае працэс станаўлення мастака на складанай дарозе жыцця, працэс пошуку ім свайго асаблівага шляху і месца ў свеце, працэс спасціжэння людзей і навакольнага свету з яго шматлікімі супярэчнасцямі. Колас таксама кажа, што мастацтва разам з каханнем здольны адрадзіць любую душу, і нават збавіць ад цемры і смерці.

Ня дзіўна, што менавіта гэты твор вырашыў інсцэніраваць Мікалай Мікалаевіч Пінігін. Мастак, які жадае расказаць пра мастака… "Я даўно думаў пра гэта," – кажа М.Пінігін ў размове з аўтрам работы, – "У творы ёсць многа рэчаў, праз якія праходзіць кожны мастак. Але з чым ён з гэтага ўсяго выходзіць – вось гэта галоўнае. Я выбраў з паэмы тое, што мне здалося важным, магчыма нехта гэта зрабіў бы зусім па-іншаму."

Спектакль складзены ў жанры містрэрыі, бо гэты жанр блізкі да "казак жыцця" Я.Коласа. "Містэрыя – гэта таінства. Усе, што чалавеку невядома – гэта тайна. А працэс спасціжэння гэтага ўсяго і ёсць таінства" – паясняе М.Пінігін, –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"У Сымона ёсць пытанні да гэтага свету. Яму цікава, як створаны свет, што ў ім, навошта, ды чаму. Сымон хоча зразумець, чаму так, а не па-іншаму. У кожнага мастака ёсць пытанні да свету!"

З першага погляду Сымон, якога іграе артыст Аляксандр Малчанаў, здаецца, звычайным хлопчыкам, нават адзенне яго такое, як ва ўсіх астатніх. Мы не можам сказаць, колькі яму год. Але гэта і непатрэбна. Ці мае сэнс, колькі мастаку гадоў? Яму можа быць 10, а можа быць і 60.... Але адразу адчуваецца, што Сымон уносіць дысананс у агульную карціну жыцця вёскі, бо ён нейкі "іншы", не такі, як маса, ён незразумелы, адарваны ад звычайнага жыцця. Сымон адначасова маленькі і дарослы чалавек. Маленькі – бо глядзіць на ўсё навокал шырока расплюшчанымі вачыма і ўспрымае, як дзіця, – пра ўсё распытвае і перапытвае. А вялікі – таму што разважае як дарослы, прычым вельмі мудры дарослы (як скажа потым яму дзед Курыла, якога Сымон нават вучыць мудрасці). Менавіта з-за такой сваёй асаблівасці Сымон нікому не патрэбны. І што страшней за ўсё – нават сваім бацькам.

"Таленавіты чалавек заўседы апанаваны сваёй думкай. У яго ёсць ідэя, якую ён павінен ажыццявіць. У яго ёсць нешта, што трэба сказаць свету. І таму для іншых ён выглядае неяк дзіўна, амаль як вар’ят!" – кажа акцёр.

Сапраўды, калі ты не такі, як усе, ты не патрэбны, цябе трэба "знішчыць", або зрабіць зразумелым – навучыць, як трэба правільна жыць! А правільна – выглядаць, як усе, весці сябе, як усе, падпарадкоўвацца і рабіць толькі тое, што загадаюць.

Цікава, што ў творчага чалавека ніколі не атрымаецца добра рабіць тое, што "загадалі". Авечак, якіх пасвіў Сымон, раздірае воўк, бо Сымон пужаецца і не можа абараніць іх. А што бывае, калі не зробіш тое, што загадалі? Пакаранне! Бацька вельмі злуецца на Сымона, б’е яго і выганяе з хаты, заявіўшы, што Сымон яму больш не сын.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Мастак (ў шырокім сэнсе гэтага слова) – назіральнік," – кажа рэжысёр спектакля. – "Ён назірае і потым стварае свае творы. У кожнага чалавека ёсць пэўнае прызначэнне. Чалавек павінен адчуць свае прызначенне, якое яму даў Бог, і выканаць яго. Мастак назірае і адлюстроўвае тое, што іншы не можа." Менавіта дзеля гэтага пакідае дзед Курыла Сымону скрыпку – інструмент, праз які з дапамогай музыкі Сымон, праходзячы праз усе абставіны свайго жыцця і адлюстроўваючы іх, будзе выражаць сябе. І гэта будзе тая памяць, якую Сымон пакіне пасля сябе– свае творы, нібыта адбіткі сваёй асобы, свайго погляду ў вечнасці.

Менавіта з дапамогай музыкі Сымон змагаецца з абставінамі. А музыка мае сілу значна большую, чым сіла чалавечых рук. Менавіта пра гэту сілу музыкі, якая літаральна ўзносіць Сымона да нябес – ў спектаклі ён на люстры ўзнімаецца над сцэнай, – Сымону ў замку кажа пан. Граць так, як пан, можа толькі той, хто ведае навуку і можа прачытаць ноты. Мастацтва ідзе ад сэрца, алё над ім трэба працаваць і развіваць яго – і тады яго зможа дасягнуць неверагодных вяршыняў!

Падчас пошукаў свайго шляху, мастак павінен не згубіць сябе. "Мастак павінен захаваць сябе, не паддацца на розныя спакусы, ў якія прыводзяць людзі, супрацьстаць ім. Мастак павінен слухаць сваё сэрца і не весціся на ўсе без разбору," – кажа А.Малчанаў. Таму і Сымон, праходзячы праз усе абставіны свайго жыцця, ня гледзячы на ўсё, жадае быць сапраўдным – такім, які ён ёсць, мець свой погляд, сваё меркаванне. Сымону не месца з жабраком, бо філасофія "звера сярод звяроў" або існавання аднаго толькі слова “дай” не можа ніколі стаць яму блізкай. Таксама Сымон не можа быць мастаком за грошы або мастаком пад замком, як хацеў карчмар, схаваўшы ад Сымона скрыпу, – мастацтва не прадаецца і не можа жыць пад прымусам, яно прыходзіць толькі туды, куды хоча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дык дзе ж месца Сымона? Там, дзе яго разумеюць і слухаюць, дзе яго заўседы чакаюць, дзе кахаюць. Там, дзе жадаюць таго ж, што і Сымон – каб ён знайшоў сябе. Сымонава месца разам з Ганнай. І тады, падчас смярцельнай хваробы, каханне, якое давала Сымону сілы ў падарожжы, можа зрабіць цуд – ацаліць каханую. Такое каханне нібыта прыносіць іншае жыцце, ўздымае над усімі людзьмі. Іншае – не у сэнсе незямное, а іншае ў сваіх якасцях. Каханне заўседы афарбоўвае жыццё ў розныя колеры, яно надае асаблівасць і мастацтву.

Спектакль Мікалая Пінігіна нібыта няскончаны. Ён ставіць перад гледачом шматкроп’е, адкрытае пытанне. Нібыта кажа: "Ідзі і шукай сябе!" "Трэба ісці ў свет, перажываць жыццё для таго, каб потым яно стала тэкстам, каб уздейнічала на іншых людзей. А для гэтага трэба быць сапраўным!" – кажа М.Пінігін. А А.Малчанаў дапаўняе: "Кожны чалавек надзелены талентам. Пытанне ў тым – ці гатовы чалавек гэта прыняць? Ці гатовы чалавек знайсці сябе і захаваць?"

Якім жа мастаком з’яўляецца Сымон-музыка на сцэне тэатра імя Янкі Купалы? Гэта такі мастак, які жыве ў пэўным часе і ў пэўнай краіне і перажывае ўсе, што адбываецца навокал яго. Гэта той, хто сваім майстэрствам перадае ўсё, што перажывае, і яго мастацтва трапляе у сэрцы людзей, прымушае іх задумацца, пачаць задаваць пытанні: што, навошта, ды чаму так, а не па-іншаму. Гэта той, хто сваімі словамі абуджае чалавека думаць, бачыць навокал сябе духоўныя рэчы, а не канцэнтравацца толькі на матэрыяльным. Гэта той, які кажа, што ў кожнага чалавека ёсць пэўнае прызначэнне, якое яму даў Бог, і што чалавек павінен адчуць яго і выканаць.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Кастылянчанка, І. Новае жыццё беларускай паэзіі // Научный интернет-журнал о театральном процессе в Беларуси [Электронный ресурс]. – 2006. –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Режим доступа: http://pensne.na.by/rectnz/sym_mus_ki.html#text_top. – Дата доступа 16.03.2010.

2. Класік сусветнай літаратуры Якуб Колас // Архивы Беларуси [Электронный ресурс]. – 2010. – Режим доступа http://archives.gov.by/index.php?id=449200. – Дата доступа 04.04.2010.

3. Колас, Я. Сымон-музыка / Я.Колас. – Мінск: Бацькаўшчына, 1955. – 214 с.

Колас, Я. Сымон-музыка / Я.Колас. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2001. – 319 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ